ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 273 (1240) | ЧАЦЬВЕР, 27-га лістапада 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

КОМСАМОЛЬСКІМ ЗЬЕЗДАМ—ПЛЯН КОНКРЭТНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ ЛКСМБ

Узяць вышыні конкрэтных спраў вялікай пяцігодкі

ПРОФЭСЫЙНЫЯ, ГАСПАДАРЧЫЯ, ГРАМАДЗКІЯ ОРГАНІЗАЦЫІ, СПЭЦЫЯЛІСТЫЯ! КОМСАМОЛ ЧАКАЕ АД ВАС ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ Ў СКЛАДАНЬНІ ПЛЯНУ

Умець абраць цэнтральнае зьвяно работы

У барацьбе за выкананьне пяцігодкі, выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, комсамол пад кіраўніцтвам партыі заўсёды высоўвае новыя і новыя формы і мэтады організацыі ініцыятывы і энтузіязму мас комсамольцаў і працоўнай моладзі. Комсамол змагаўся ня толькі за найлепшыя вынікі ў выкананьні намечаных Дзяржплянуючымі органамі програмы, але прымаў актыўны ўдзел у непасрэдным складаньні плянаў; сустрэчны промфінплян, рух опэрацыйных плянавых груп на прадпрыемствах, колгаснатворчы паход комсамолу вёскі, адна з галоўнейшых задач якога—барацьба за гадовы вытворчы плян колгасу, організацыя сустрэчных опэрацыйных плянаў колгасу і г. д.

Перадзьездаўскі пэрыод—пэрыод масавай праверкі работы комсамолу паказвае, што комсамол Беларусі і асабліва вясковая організацыя ўсё яшчэ змагаецца наогул за выкананьне гаспадарчых плянаў (колектывізацыя, жывёлагадоўля, вясеньняя і асеньняя пасеўкампаніі і г. д.), ня ведаючы аб тым, якая галіна гаспадаркі, ва ўмовах раёну іх дзейнасьці, зьяўляецца вядучай на развіцьцё якое галіны гаспадаркі накіраваць галоўную ўвагу комсамольскіх ячэек.

Таму ініцыятыва беларускай старонкі „Комсомольской Правды» аб распрацоўцы к X беларускаму і IX усесаюзнаму зьезду ЛКСМ пляну конкрэтных дзеяньняў беларускага комсамолу набывае асабліва важнае значэньне, сутнасьць якога ў тым, што:

На аснове кантрольных лічбаў 3-га году пяцігодкі, зацьверджаных партыяй і ўрадам для кожнага раёну паасобку, на грунце вучоту яго экономічных асаблівасьцяй і навуковых даных (дасьледчых станцый і інш.) аб тым, якія культуры і галіны гаспадаркі ва ўмовах таго ці іншага раёну зьяўляюцца больш прыбытковымі, таварнымі і якія галіны сельскай гаспадаркі ў даным раёне (жывёлагадоўля, мэліорацыя, тэхнічныя культуры, сады і агароды, лясная гаспадарка і г. д.) павінны быць вядучымі галінамі ў адносінах да рэшты, на грунце гэтых даных комсамольская організацыя раёну павінна будзе намеціць сабе плян конкрэтных дзеяньняў.

Плян дзейнасьці комсамолу будзе складацца з 5-ці асноўных частак: 1. Сельская гаспадарка, 2. Прамысловасьць, 3. Транспарт, 4. Капітальнае будаўніцтва. 5. Кадры. З падзелам на паасобныя падраздзелы. Сельская гаспадарка падзяляецца на: жывёлагадоўлю, мэліорацыю, тэхнічныя культуры, сады і агароды і лясную галіну. Прамысловасьць—на: горную, хэмічную, металяпрацоўчую, машынабудаўнічую і харчовую. Вось гэта кола асноўных пытаньняў, якія ўвойдуць у плян конкрэтнай дзейнасьці беларускага комсамолу на 3-ці год пяцігодкі.

Для прапрацоўкі кожнага з гэтых пытаньняў складзены брыгады, куды прыцягнуты навуковыя сілы і спэцыялістыя.

Складаньне пляну конкрэтнай дзейнасьці комсамолу будзе праводзіцца ў такім напрамку. Зараз складаюцца кантрольныя лічбы кожнага раёну, згодна зацьверджаных кантрольных лічбаў на 1931 год, навуковых даных і экономічных асаблівасьцяй кожнага раёну паасобку. Гэтыя лічбы зараз падрыхтоўваюць студэнты факультэту Наргасу БДУ.

Кантрольныя лічбы для кожнага раёну будуць прапрацаваны дадаткова ў раёнах, дзе на аснове конкрэтных лічбаў 3-га году пяцігодкі і вучоту ўнутраных рэсурсаў будуць організоўвацца сустрэчныя опэрацыйныя пляны дзейнасьці комсамольскіх ячэек і намячацца конкрэтныя мерапрыемствы па іх выкананьню і перавыкананьню.

Што атрымае комсамол ад гэтага мерапрыемства.

Па-першае: плян конкрэтнай дзейнасьці комсамолу зьявіцца рашучым вагаром яшчэ большага павароту вясковага комсамолу тварам да гаспадарчага будаўніцтва.

Па-другое: комсамольская організацыя ня будзе змагацца наогул за ўраджай, а будзе змагацца за ўраджай вядучых культур, будзе змагацца за пасьпяховае разьвіцьцё тэй галіны гаспадаркі, якая ў даным раёне зьяўляецца найбольш прыбытковай, г. зн. што калі ўсе ўмовы ў раёне спрыяюць для разьвіцьця тэхнічных культур, дык комсамол і будзе змагацца за ўзьняцьце ўраджаю тэхнічных культур, і каб гэтыя культуры ў найкарацейшы тэрмін сталі вядучай галіною гаспадаркі раёну.

Па-трэцяе: яскравае ўяўленьне таго, за што конкрэтна трэба змагацца, дасьць большую мажлівасьць комсамольскай організацыі (камітэтам, ячэйкам) намеціць конкрэтныя формы і мэтады сваёй барацьбы за выкананьне і перавыкананьне плянаў, намеціць мерапрыемствы па мобілізацыі ўсёй вясковай грамадзкасьці на выкананьне гэтых конкрэтных задач.

Па-чацьвертае: комсамольская організацыя раёну, ячэйка і кожны комсамолец паасобку добра ўявяць сабе напрамак разьвіцьця гаспадаркі ня толькі на сёньняшні дзень, але і пад якім кутом погляду павінна ісьці далейшае разьвіцьцё гаспадаркі на працягу шэрагу бліжэйшых год, што дасьць магчымасьць на кожны надыходзячы год сваячасова намеціць конкрэтныя задачы, над выкананьнем якіх павінна працаваць комсамольская організацыя, дасьць поўную магчымасьць вясковай ячэйцы сваячасова падрыхтавацца да задач наступнага году і сваячасова падрыхтаваць свой вытворчы сустрэчнаопэрацыйны плян работы.

Задача комсамольскіх ячэек і камітэтаў.

З 1 сьнежня па раёнах пачнецца прапрацоўка плянаў конкрэтных дзеяньняў комсамолу. Да гэтага часу райкомы і ячэйкі павінны правесьці адпаведную масавую працу сярод колгасьнікаў, рабочых саўгасаў, беднякоў і серадьнякоў аднаасобнікаў. Павінны добра азнаёміцца з экономікай свайго раёну, сельсавету, колгасу і вёскі з тым, каб на гэтым грунце будаваць свой сустрэчны опэрацыйны плян. Павінны організаваць брыгады з комсамольцаў, працоўнай моладзі, з прыцягненьнем мас колгасьнікаў, спэцыялістых і ўсіх культурных сіл вёскі для прапрацоўкі асобных пытаньняў пляну і падрыхтоўкі сустрэчнага опэрацыйнага пляну ячэйкі.

Улічваючы, што да X зьезду ЛКСМБ застаўся зусім малы час, камісія ЦК ЛКСМБ пастанавіла: „Лічыць неабходным прадставіць у канчатковай распрацоўцы к X зьезду ЛКСМБ плян конкрэтных дзеяньняў па лініі сельскай гаспадаркі і орыентовачна па ўсіх астатніх галінах“. Таму мы ў сваім артыкуле ў асноўным завастрылі большую ўвагу на працы вясковай комсамольскай організацыі. Галоўнейшая задача вытворчых комсамольскіх ячэек,—гэта зараз-жа разгарнуць у сябе на вытворчасьці масавую падрыхтоўчую работу па прапрацоўцы кантрольных лічбаў, сабраць матар'ялы для сустрэчнага опэрацыйнага пляну, зрабіць орыентовачныя наметкі конкрэтнай дзейнасьці комсамолу на вытворчасьці і г. д.

Комсамол паставіў перад сабой грандыёзьнейшую па сваёй важнасьці задачу. Пасьпяховасьць выкананьня яе залежыць ня толькі ад комсамолу але і ад таго, наколькі акажуць комсамолу практычную дапамогу спэцыялістыя, гаспадарчыя, профсаюзныя і савецкія органы, наколькі яны ўразумеюць вялікую важнасьць гэтай задачы і будуць сумесна з комсамолам змагацца за найхутчэйшае яе ажыцьцяўленьне.

Мобілізуючы сілы і ўвагу комсамолу і пролетарскай грамадзкасьці, комсамол Беларусі павінен прыйсьці на свой X зьезд з плянам конкрэтных дзеяньняў на 3 год пяцігодкі.

Уключайцеся ў складаньне пляну конкрэтных дзеяньняў Беларускага комсамолу

Пастанова

бюро ЦК ЛКСМБ ад 19-XI 1930 г. аб складаньні пляну конкрэтных дзеяньняў ЛКСМБ

1. Бюро ЦК ЛКСМБ ухваляе ініцыятыву беларускага аддзяленьня „Комсомольской Правды“ у справе прапрацоўкі да X усебеларускага і IX ўсесаюзнага зьездаў КСМ пляну конкрэтных дзеяньняў беларускага комсамолу на грунце агульна-гаспадарчага пляну 3-га году пяцігодкі.

2. Прапрацоўку кантрольных лічбаў у раённым разрэзе і організацыю сустрэчных опэрацыйных плянаў комсамолу, з вучотам экономічных асаблівасьцяй кожнага раёну, ускласьці на т. т. Гуткіна, Юрк'янца (ЦК), Дубінскага (беларускае аддзяленьне („Комсомольской Правды“), Дамарацкага („Чырвоная Зьмена“).

Старшынёю зацьвердзіць т. Гуткіна, намесьнікам—Юрк'янца.

3. Лічыць неабходным прапрацоўку пляну конкрэтных дзеяньняў комсамолу праводзіць сумесна з цэнтральнымі плянавымі і гаспадарчымі органамі на аснове навуковых даных, а таксама станцый.

4. Да ўдзелу ў распрацоўцы плянаў прыцягнуць комсамольскія ячэйкі СНК, Дзяржпляну, ВСНГ, Наркомзему, Інстытуту Народнай Гаспадаркі і БГУ.“

5. Прапанаваць рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ ўключыцца ў праведзеньне гэтага мерапрыемства, шырока асьвятляючы на сваіх старонках ход працы па распрацоўцы пляну конкрэтных дзеяньняў комсамолу.

ЦК ЛКСМБ.

Організуем сустрэчны опэрацыйны плян конкрэтных дзеяньняў ЛКСМБ

Пастанова

нарады сэкратароў і ЭКАМО—працаўнікоў Кастрычнікаўскага РК ЛКСМБ ад 21-XI 1930 г.

Заслухаўшы інформацыю аб пастанове ЦК ЛКСМБ па пытаньню прапрацоўкі к X усебеларускаму і IX ўсесаюзнаму зьездам опэрацыйнага пляну конкрэтных дзеяньняў комсамолу ў 3 годзе пяцігодкі, на грунце агульна-гаспадарчага пляну 3 году пяцігодкі,—нарада адзначае, што складаемы опэрацыйны плян дзеяньняў ЛКСМБ дасьць магчымасьць комсамольскай організацыі яшчэ больш актыўна змагацца за выкананьне і перавыкананьне 3-га году пяцігодкі, дасьць магчымасьць змагацца ня толькі наогул за выкананьне плянаў, але і за вядучую галіну гаспадаркі таго ці іншага раёну, плянавай расстаноўкі сіл кожнай комсамольскай організацыі, раённай організацыі і зьявіцца магутным вагаром яшчэ больш рашучага павароту ўсёй, і асабліва вясковай часткі комсамольскай організацыі, тварам да гаспадарчага будаўніцтва.

Ухваляючы ініцыятыву беларускай старонкі „КП“ і рашэньні ЦК ЛКСМБ, нарада ўключаецца ў працу па разгортваньню масава-падрыхтоўчай работы і падрыхтоўкі сваіх сустрэчных опэрацыйных плянаў конкрэтных дзеяньняў комсамольскай ячэйкі (фабрыка, завод і г. д.). Адначасова нарада заклікае ўсе комсамольскія організацыі Беларусі і працоўную моладзь прыняць самы актыўны ўдзел у складаньні плянаў конкрэтных дзеяньняў комсамолу.

Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ

26 брыгад ужо распачалі працу

24-XI пры Дзяржпляне адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў ЦК комсамолу і студэнтаў. Наргасу БДУ, дзе разглядалася пытаньне аб складаньні баявых плянаў дзеяньня комсамолу.

Організавана 26 брыгад, у які ўцягнуты ўсе студэнты Наргасу. Брыгады ахапілі ўсе галіны народнай гаспадаркі. У кожнай брыгадзе працуюць 2-3 чалавекі.

К 27-XI будзе закончан збор матар'ялу па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, пасьля чаго зводная брыгада пабудуе плян разьвіцьця народнай гаспадаркі па БССР на 31 год, г. зн. на 3-ці год пяцігодкі.

28 будзе склікана нарада навукова-дасьледчых організацый і Наркаматаў, на якой будзе заслухан даклад старшыні Дзяржпляну аб пляне разьвіцьця народнай гаспадаркі на 1931 год і зацьверджэньня асноўных вядучых об'ектаў для кожнага раёну.

Увесь матар'ял будзе сабраны і прадстаўлены X зьезду комсамолу.

Неабходна ўсім комсамольскім організацыям зараз-жа падхапіць пачын ячэйкі Наргасу БДУ і прыняць актыўны ўдзел у складаньні пляну баявых дзеяньняў комсамолу Беларусі.

Г. ФРЫД.

Агэнты інтэрвэнцыі перад пролетарскім судом

„Таямніцы“ разбойніка Пуанкарэ выкрываюцца ў паказаньнях контррэвалюцыянэраў

Няма літасьці ворагам пролетарскай дыктатуры

ПАДПАЛЬШЧЫКАМ ВАЙНЫ НЯМА ЛІТАСЬЦІ

Перад Вархоўным судом прадсталі агэнты расійскай контррэволюцыі, простыя наймітьі французскага капіталу. На лаўцы падсудных—галоўныя заправілы контррэволюцыйнай „прампартыі“ на чале з Рамзіным.

Засьцігнутыя АДПУ у самым разгары сваей злачыннай работы, схопленыя з позыцый яны трымаюць цяпер адказ перад клясавым судом пролетарскай дыктатуры. Рамзін—гэты папяровы прэм'ер—міністр „капіталістычнай Расіі“, Калінынікаў, Ларычаў і Тарноўскі на простае ва ўпор пастаўленае судом пытаньне,—прызналі правільным абвінаваўчае заключэньне. Ужо матар'ял абвінаваўчага заключэньня сьведчаць аб організуючай ролі французскага імпэрыялізму ў справе падрыхтоўкі новай антысавецкай інтэрвэнцыі. Цяпер мы ўладаем сьведоцтвам галоўнай фігуры падсудных—Рамзіна.

Рамзін на судзе 25 лістапада сваімі ўласнымі вуснамі не толькі пацьвердзіў даныя абвінаваўчага заключэньня, але і ўказаў на шэраг новых фактаў, якія сьведчаць, што іменна французскі генэральны штаб зьяўляецца організуючай сілай узброенай інтэрвэнцыі супроць СССР. Паказаньні Рамзіна на адкрытым судзе крок за крокам ускрываюць з бясспрэчнай відочнасьцю агідны малюнак таго, як кіруючыя сфэры французскага капіталу рыхтавалі і працягваюць рыхтаваць крывавы паход узброеных банд супроць Савецкага Саюзу. Учарайшыя паказаньні Рамзіна з галавой выдаюць разбойніка Пуанкарэ, які імкнецца адмаўляць сваю кіруючую ролю і ўдзел французскага генэральнага штабу ў падрыхтоўцы ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР. Уроджаны разбойнік злоўлены на сьвежым учынку: ён выкрываецца яго ўласным агэнтам—Рамзіным.

Мільёны рабочых і сялян Савецкага Саюзу вынесьлі ўжо свой прысуд шкоднікам і інтэрвэнтам. У Маскве, Ленінградзе, Харкаве, па ўсім Савецкім Саюзе, у тысячы і тысячы колгасаў і ўсяк рабочыя і сяляне СССР дэмонстравалі непрымірымую нянавісьць да інтэрвэнтаў. Дэмонстравалі непахісную рашучасьць жалезнай сьцяною абараняць краіну соцыялізму ад малейшых замахаў на яе з боку шкоднікаў інтэрвэнтаў. Адбыўшыяся 25 лістапада па ўсім Савецкім Саюзе дэмонстрацыі, у якіх прынялі ўдзел многія мільёны рабочых і сялян, а таксама лепшая частка тэхнічнай інтэлігэнцыі, навуковых работнікаў, настаўніцтва і інш. зьяўляюцца новым довадам згуртаванасьці рабочае клясы і шырокіх мас працоўных вакол ленінскай партыі.

На дэмонстрацыі 25 лістапада мільёны рабочых і сялян СССР яшчэ раз голасна заявілі інтэрвэнтам, што ўсе іх надзеі на крах пяцігодкі, разьлікі на зрыў колектывізацыі, на адмову ад політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на гібель савецкай улады—дарэмны, нязбытачныя. На падрыхтоўку інтэрвэнцыі, на агідную падрыўную работу шкоднікаў, на спробы інтэрвэнтаў раздушыць СССР, на зьвярыную барацьбу кулацтва супроць соцыялізму мільённых рабочых, сялян, а таксама соткі тысяч сумленных і адданых рабочай клясе спэцыялістых адказваюць разгортваньнем соцыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і ўмацненьнем баявой магутнасьці Чырвонай арміі.

Учора ў сваім паказаньні Рамзін яшчэ раз заявіў, што „прампартыя“ орыентавалася і рабіла стаўку на ўзмацненьне барацьбы ўнутры УсеКП(б), на перамогу правых элемэнтаў партыі. Але і гэта стаўка падпальшчыкаў вайны аказалася цалкам і поўнасьцю бітай.

Наша партыя моцна і адзіна. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК партыя разьбіла ўшчэнт правых і „левых“ опортуністых, двурушнікаў, дэмонструючы сваю ідэйную згуртаванасьць і сілу, папаўняючы свае шэрагі соцьнямі тысяч лепшых рабочых-ударнікаў. На падрыўную работу шкоднікаў і падрыхтоўку к інтэрвэнцыі мільёны працоўных пад кіраўніцтвам нашай партыі адказалі магутным уздымам вытворчага энтузіязму, далейшым ростам і ўмацаваньнем ударніцтва і соцспаборніцтва. Сотні і тысячы новых ударных брыгад зьяўляюцца адказам на вылазку інтэрвэнтаў і шкоднікаў і новым довадам таго, што лёзунг „пяцігодка — у чатыры гады“ будзе выкананы і перавыкананы, наперакор усім надзеям і падрыўной рабоце імпэрыялістых і іх агэнтаў.

Ставячы новую стаўку на ўзброеную інтэрвэнцыю, „прампартыя“ з усіх сіл імкнулася дэзорганізаваць ня толькі прамысловасьць, але і соцыялістычную перабудову вёскі. Шчыльна змыкаючыся з кулацкай контр-рэволюцыйнай партыяй Кандрацьцева, Казанава і іх гнюсных саратнікаў, „прампартыя“ імкнулася зьвязацца з кулацтвам супроць дыктатуры пролетарыяту і тым самым расчысьціць шлях зарубежным інтэрвэнтам. Аднак, і гэта надзея агэнтаў інтэрвэнцыі аказалася цалкам перакінутай.

Ня глядзячы на шкодніцтва ў галіне прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадаркі, соцыялістычнае будаўніцтва знаходзіцца на ўздыме, разьвіваючыся буйнымі тэмпамі. Савецкі Саюз ператвараецца ў няпрыступную цытадэль, аб якую разаб'юць сабе галаву імпэрыялістычныя драпежнікі. Сусьветныя капіталістычныя акулы ставілі стаўку на зрыў і развал народнай гаспадаркі СССР.

Крывавы сабака Пуанкарэ імкнуўся шляхам організацыі голаду ў СССР, зрыву соцыялістычнага будаўніцтва закінуць капіталістычную вудачку на шыю працоўных мас нашага Саюзу. Злоўлены на сьвежым учынку Пуанкарэ і кампанія ня ўнікнуць суровага пролетарскага суда. Ужо першы дзень працэсу паказаў, што на лаўцы падсудных разам з шкоднікамі сядзяць і капіталістычныя адломкі былой царскай Расіі, якія стаяць за іх сьпіною, а таксама імпэрыялістычныя групкі Францыі на чале з Пуанкарэ.

Адказ мільённых мас пролетарыяту і працоўных гораду і вёскі, якія ўчора вышлі на вуліцу, каб протэставаць супроць спроб закабаленьня СССР з боку інтэрвэнтаў,—ясна паказвае, што стаўка сусьветных драпежнікаў біта. Паны інтэрвэнты павінны памятаць: першая інтэрвэнцыя закончылася для іх поўным правалам, другая закончыцца крахам капіталізму. „Правда“

Патрабуем расстрэлу шкоднікаў

Заслухаўшы даклад аб контррэволюцыйнай організацыі, так званай „Прамысловай Партыі“, якая займалася шкодніцтвам з мэтай сарваць пяцігадовы плян соцыялістычнага будаўніцтва, агульны сход яч. ЛКСМБ—руху МББ разам з беспартыйнай моладзьдзю і піонэрамі вітае АДПУ, якая выкрыла контррэволюцыйную зграю, і з вялікім абурэньнем ганьбіць наймітаў капіталу.

У адказ на контррэволюцыйныя дзеяньні шкоднікаў, пастанаўляем уступіць на 100 проц. у шэрагі ТД-Авіяхэму і абвяшчаем сябе ўдарнымі як на працы ТД-Авіяхэму, так і па іншых галінах працы ячэйкі і вытворчасьці.

З свайго боку запэўніваем ЦК УсеКП(б) і УсеЛКСМ, што будзем лепшымі застрэльшчыкамі ва ўсёй працы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, а таксама па выкананьню заданьняў партыі і комсамолу.

Патрабуем расстрэлу шкоднікаў соцыялістычнага будаўніцтва. Просім урад узнагародзіць ордэнам Леніна нашу слаўную АДПУ.

Яшчэ больш узмацнім клясавую пільнасьць

Мы, комсамольцы яч. Менскага райспажыў т-ва „Зямляроб“ і гаррабачкому Працземлесу, протэстуем супроць агіднейшай вылазкі клясавага ворага і патрабуем прыняцьця да контррэволюцыянэраў вышэйшай меры соцыяльнай абароны.

Адначасова мы абяцаем яшчэ больш узмацняць нашу клясавую пільнасьць для барацьбы з усякімі вылазкамі ворага.

Няхай жыве верны вартаўнік пролетарскай дыктатуры—АДПУ!

„Пуанкарэ злачынца-рэцыдывісты перад пролетарыятам“

БЭРЛІН, 24.—„Ротэ Фанэ“ зьмяшчае характарыстыку Пуанкарэ ў форме абвінаваўчай прамовы. „Ротэ Фанэ“ заяўляе, што Пуанкарэ, з пункту погляду пролетарыяту, зьяўляецца злачынцам-рэцыдывістым. Газэта адзначае шэраг водгукаў нямецкага друку ўсіх кірункаў аб Пуанкарэ ў час гвалтоўнага ўваходу французскіх войск у Рурскую вобласьць. Буржуазна-дэмократычныя газэты Нямеччыны называлі тады Пуанкарэ „пастаяннай пагрозай міру“ „ворагам прымірэньня народаў“, „падпальшчыкам амаль з паталёгічнай псыхолёгіяй“, „ганьбай для Эўропы“ і г. д. Нацыяналістычныя газэты Нямеччыны называюць Пуанкарэ „пасланьнікам пекла“, „Рурскім забойцам“, „чумой“, і г. д.

Адна газэта пісала: „гэта не чалавек, а зьвер“.

„Ротэ Фанэ“ працягвае:—„калі нямецкі друк, які ў свой час вынес такі рэзкі прысуд абвінавачванаму Пуанкарэ, сёньня замоўчвае новае злачынства яго, то гэта не зьяўляецца апраўданьнем Пуанкарэ. Маўчаньне буржуазіі Юнгаўскай Нямеччыны ў пытаньні аб падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу паказвае, наколькі ўжо насьпелі пляны інтэрвэнцыі, але гэта не пасьлабляе ні ў якой меры прыгавору, які друк гэтай-жа буржуазіі вынес Пуанкарэ ў 1923 годзе.

Гады павінны быць зьнішчаны

Мы, студэнты Менскага Транспартна-Экспэдыцыйнага Тэхнікуму, глыбока абураны агідным шкодніцтвам групы контррэволюцыянэраў, якія падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю супроць адзінай у сьвеце краіны пролетарскай дыктатуры.

Гады, якія падняли руку на пролетарскую дзяржаву з мэтай яе зьнішчэньня, самі павінны быць зьнішчаны праз вышэйшую меру соцыяльнай абароны—расстрэл.

Хадайнічаем аб узнагародзе вернага вартаўніка пролетарскай дыктатуры пролетарыяту—АДПУ ордэнам Леніна.

У адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі, мы, усе, як адзін, падпісваемся на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ і наладжваем збор сродкаў на пабудову дырыжабля „Правда“.

Па даручэньню агульнага сходу—студком

Яшчэ з большай упартасьцю будзем змагацца за бальшавіцкія тэмпы

У адказ на контррэволюцыйныя дзеяньні „прамысловай партыі“ мітынг Барысьцеўскай ШКМ запэўнівае компартыю і савецкую ўладу, што мы будзем з яшчэ большай упартасьцю змагацца за бальшавіцкія тэмпы ва ўсёй рабоце, за лепшую якасьць колгасных кадраў для няўхільнага ажыцьцяўленьня задач суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы.

Вышэй сьцяг соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Мы патрабуем суровага пакараньня контррэволюцыйных шкоднікаў—расстрэлу.

Хадайнічаем аб узнагародзе ОДПУ ордэнам чырвонага сьцягу.

Барысьцеўская ШКМ, Аршанскага раёну.

Максім Горкі

„Рабочыя і сяляне ўсяго сьвету павінны вызваліць сябе ад улады капіталу“

Адозва т. Горкага да рабочых і сялян

У Маскве ў Вярхоўны суд рабочых і сялян Саюзу Соцыялістычных Савецкіх рэспублік судзіць людзей, якія організавалі контррэволюцыйную змову супроць рабоча-сялянскай улады. Пролетары ўсіх краін, асабліва вы, рабочыя Францыі і Англіі, павінны зразумець сэнс гэтай змовы і яе значэньне, бо і вам прыдзецца мець справу з такімі-ж здраднікамі, якіх судзяць у Маскве. Гэтыя людзі—спэцыялістыя па тэхніцы, вучоныя,—лёкаі капіталістых, выгнаных з Расіі, злоўлены з палічным і прызналіся ў цэлым радзе агіднейшых злачынстваў супроць рабочых. Яны, карыстаючыся сваімі ведамі і давер'ем савецкай улады, імкнуліся ўсімі спосабамі шкодзіць справе будаўніцтва рабочымі сваёй дзяржавы і соцыялістычнага грамадзтва. Яны ўскладнялі разьвіцьцё прамысловасьці ў Саюзе Саветаў, псавалі ўсё, што можна псаваць, бяссэнсоўна трацілі сродкі працоўных мас, стараючыся ўсяляк перашкодзіць росту і разьвіцьцю гаспадаркі краіны, яны штучна стваралі ў краіне Саветаў гаспадарчыя затрудненьні. Усё злачыннае, што яны зрабілі, рабілася імі для таго, каб разбурыць работу савецкай улады і разьвіцьцё гаспадаркі Саюзу Саветаў, стварыць у Саюзе хаос, выклікаць нездавальненьне савецкай уладай у масах народу, асабліва сялянства. Рабілася гэта імі па ўзгадненьню і пад кіраўніцтвам усіх рускіх капіталістых, якія эміграваліі з Расіі і жывуць зараз у Эўропе, а больш за ўсё ў Парыжы, і якія хочуць аднавіць сваю ўладу над рабочай клясай і сялянствам Саюзу Саветаў.

Зразумела, што рускія фабрыканты і банкіры не разьлічваюць вярнуцца ў Расію, узброеныя толькі сваімі кулакамі і кішэнямі. Справа ўсіх капіталістых аднолькава на ўсім сьвеце, справа гэта—эксплёатацыя працы рабочых. Таму, натуральна, што рускія капіталістыя знайшлі сярод капіталістых Францыі і Англіі поўнае спачуваньне сваім злачынным мэтам. Пуанкарэ-вайна, Брыян, Чэрчыль і інш. авантурыстыя на службе капіталу ахвотна пайшлі насустрач мэтам расійскіх тэхнікаў і машэньнікаў. Французскім генштабам, супольна са шкоднікамі, якіх у Маскве судзіць народны суд, выпрацаван плян ваеннага нападу на Саюз Саветаў,—плян інтэрвэнцыі.

Агідная і разбураючая работа шкоднікаў у Саюзе Саветаў была распачата для таго, каб палегчыць арміям інтэрвэнтаў разбойніцкі напад на Саюз Саветаў у 1930-31 годзе. Меркавалася справакаваць савецкую ўладу на вайну супроць рабочых і сялян Польшчы і Румыніі, а рабочым і сялянам Францыі, Англіі выступіць, быццам для абароны гэтых краін,—ужо эканамічна падняволеных капіталу буйных імпэрыялістычных драпежнікаў. Вайна капіталістым выгадна, яны гандлююць зброяй і добра нажываюцца на крыві рабочых. Яны ня спыняцца перад жахамі новай вайны, хаця ведаюць, што жах перавысіць усё тое, што было ў 1914-18 г. г. Капіталістыя не пашкадуюць зьнішчыць яшчэ 20-30 мільёнаў рабочых і сялян. Справа ўсіх капіталістых ва ўсім сьвеце аднолькавая. Справа рабочых і сялян таксама аднолькавая ва ўсім сьвеце: рабочыя і сяляне павінны вызваліць сябе ад улады капіталу, ад галечы і выміраньня.

Рабочыя! Вам даўно пара зразумець, што крыніца ўсяго зла і гора, усіх няшчасьцяў жыцьця, крыніца гэта—хцівасьць нікчэмнай меншасьці людзей, якія адзічэлі, звар'яцелі ад прагнасьці накапленьня, і беззаконна, бяссэнсоўна камандуюць жыцьцём працоўнай большасьці, растрачваючы яе сілы, зьнішчаючы скарбы зямлі, якія належаць вам.

Успомніце, што за 4 гады імпэрыялістычнай вайны былі патоплены ў морах мільярды тон вугалю, які вы здабылі; зьнішчана надзвычай вялікая колькасьць скуры, тканін і ўсякіх прадуктаў вашае працы. Зьнішчаюцца скарбы, якія належаць вам, вашым дзецям, але, зьнішчаючы гэтыя скарбы, руйнуючы вас, зьнішчаючы мільёны вашых бацькоў і братоў па крыві і па клясе,—капіталістыя нажываюць жыр і золата. Сотні тысяч рабочых будуюць судны, якія будуць патоплены, робяць гарматы, кулямёты, вінтоўкі, якія, нарэшце, паслужаць для таго, каб забіваць вас. Вы, таксама, зразумела, будзеце забіваць рабочых і сялян ні ў чым не вінаватых перад вамі, таксама, як і вы не вінаватыя перад імі. І гэта ўзаемная адсутнасьць вінаватасьці робіць злачыннасьць ... ны яшчэ больш вар'яцкай і злачы... най. Узбройваючы капіталістых, ... працуеце супроць сябе, ваша ... на вайну—самагубства. Вас хоч... паслаць супроць рабочых і сялян ... вецкага Саюзу, якія паказваюць ... як добра можна жыць і працаваць ... гаспадароў. Буржуазны друк ... дзенна хлусіць і паклёпнічае на ... Саветаў, выдумваючы розныя ... ствы і жахі. Ён робіць гэта для ... каб выклікаць у вас недавер'е да ... сьпехаў рабочых Савецкага Са... каб настроіць вас варожа да рабо... Буржуазны друк дасканала ведае, ... колькі вялікія посьпехі рабочага ... даўніцтва ў Саюзе Саветаў, якія ... вялізарныя, ня глядзячы на орга... ванае шкодніцтва прадажных ... Буржуазны друк вельмі добра ... мее, чым пагражаюць гэтыя посьп... сусьветнаму капіталізму. Але бур... азная прэса—паслушная зброя ... жуазіі, буржуазныя журналістыя— ... леныя людзі, яны ня могуць гавар... праўды, а калі-б і захацелі сказаць ... дык гаспадары газэт выкінуць жур... лістых на вуліцу таксама, як і фаб... канты выкідаюць вас.

Капіталістыя ведаюць, што ... лі рабочыя Саюзу Саветаў дасягн... сваёй мэты, а яна ўжо блізка, вы ... сама пасьледуеце прыкладу пра... нага народу савецкіх рэспублік. ... увушаюць варожасьць да рабоч... лянскай улады Саюзу Саветаў ... прычыны, што краіна саветаў— ... зарны рынак і што зямля СССР ... да багата. Вам увушаюць варож... да яе са страху, што рабочыя і ... не Саюзу Саветаў шпарка і няс... лена капаюць магілу капіталізму... піталістыя хочуць, каб вы пайш... сьмерць дзеля панаваньня іх ула... дзеля ўзбагачэньня іх. У Саюзе С... таў нават дзеці-піонэры ўжо ве... што ўсякая вайна, апрача вайны ... бочых супроць гаспадароў, ёсьць ... мае жахлівае злачынства рабочых ... ных краін адзін супроць аднаго.

Народ Саюзу Саветаў ня хоча ... ны, але вы павінны ведаць, што ... не баіцца яе і гатоў да яе. Вы ... ведаеце, што 12 год таму назад ... чыя і сяляне Саюзу Саветаў адн... ся змагацца супроць вас і амаль ... зброі, галодныя, напоўапранутыя ... білі арміі афіцэраў, якімі каман... вучоныя генэралы і якіх вельмі ... ўзброілі капіталістыя Францыі і А...

Цяпер Саюз Саветаў мае ... ўзброеную армію, кожны баец ... вельмі добра ведае, што ён ... змагацца за сваю волю, за волю ... ны, дзе ён поўнапраўны гасп... дзе няма гаспадароў, апрача ра... і сялян. Вы будзеце змагацца за ... рэсы, варожыя вам, за інтарэсы ... талістых, якія гандлююць вашы... лам і крывёю. Яны прадаюць ... аднаму зброю, якую вы зрабілі, ... чыма, што вас будуць забіваць ... на з тых гармат і вінтовак, якія ... лены вашымі рукамі і прададзены ... мі гаспадарамі вашым, быццам ... гам.

Ці зразумела вам зьдзіўляючае ... умне“ вашых пасыўных адносін ... тэй крывавай бойні супроць вас, ... зноў задумалі вашы гаспадары, ... вучаныя жыць грабяжом вашай ... кай працы. Яны ўзброіліся для ... яшчэ больш жахлівай, чым вайна ... 18 г. Яны зноў хочуць зьнішчыць ... ка ечыць мільёны людзей. Ці ... вы гэтага?

Вы ў стане не дапусьціць ... вы—тыя людзі, якія яшчэ ... зразумець бяссэнсоўнасьць і ... насьць новай вайны, зможаце ... па руках авантурыстых. У вас ... для гэтага ўсе сродкі. У прыват... ці, вы, рабочыя Францыі і Англіі ... вінны-б патрабаваць ад сваіх ... каб яны прагналі вон расійскіх ... эмігрантаў і капіталістых, якія ... лі-б прадаць рабочых і сялян ... Саветаў вашым капіталістым. Гэта ... трабаваньне павінна быць ... вам ня толькі клясавым пачуцьцём ... салідарнасьці пролетарыяту ўсіх ... але і простым пачуцьцём сама... супроць чужых вам людзей, якія ... купляючы вашых гаспадароў і ... раў абяцанкамі падзяліцца з ... бычай, провокуюць новую вайну, ... торая зьнішчыць жыцьцё не ... мільёну рабочых.

Протэставаць супроць гэтай ... павінны жанчыны, ... стры, павінны-б протэставаць ... інтэлігэнты-„гуманісты“, якія ... на протэставалі супроць кары, ... даючы, як ганебна было злачы...

Фініш—IX зьезд УсеЛКСМ

НЯСЕМ ЭСТАФЭТУ УПЕРАД

ЗАГРУЗЬЛІ НА ПОЎДАРОЗЕ

маршруты культэстафэты ў Барысаўскім, Грэскім і Петрыкаўскім раёнах

Профсаюзныя організацыі не ўдзяляюць патрэбнае ўвагі культэстафэце

Да X зьезду ЛКСМБ—прыйсьці з першымі рапартамі аб паказчыках у выкананьні маршрутаў культэстафэты

Даць сапраўдны бальшавіцкі ход

Тав. Дрозд—старшыня барысаўскага мясцкому чыгункі—„**ня мае часу займацца эстафэтамі**". Культэстафэта ня тычыцца гэтага махровага бюрократа. І ня толькі Дразда. Профэсыйныя організацыі яшчэ слаба павярнуліся да справы ажыцьцяўленьня маршрутаў культэстафэты. Правядзеньне гэтай політычнай кампаніі зьяўляецца нечым чужым для некаторых профсаюзных дзеячоў тыпу **Дразда**.

Першы месяц культэстафэты скончыўся. Зараз неабходна ўжо падвесьці некаторыя вынікі. Нельга не адзначыць, што побач з дасягненьнямі ў галіне ажыцьцяўленьня культэстафэты, ў шэрагу раёнаў яна праходзіць надзвычайна марудна, альбо зусім захрасла на дарозе.

Барысаўскі штаб культэстафэты бязьдзейнічае. Яму патурае Грэскі, Петрыкаўскі р-н і шэраг інш. Культэстафэта не дашла да ўсіх комсамольскіх ячэек, ня ўсе маршруты выкананы.

Разгортваючы працу па першых маршрутах (ліквідацыя няпісьменнасьці і барацьба за ўсеагульнае навучаньне, за політэхнічную школу), апошнія маршруты культэстафэты (барацьба за вацыянальна-культурнае будаўніцтва, разгортваньне тэхнічнай асьветы, ажыўленьне працы т-ва „Ваяўнічых Бязбожнікаў") не знашлі адлюстраваньня ў працы атраду культармейцаў.

Першы месяц прайшоў. Уперадзе—яшчэ ля паўтара месяца барацьбы за ажыцьцяўленьне ўсіх маршрутаў культэстафэты. Толькі пры ўмовах сувязі ўсяе працы з барацьбой за прамфінплян ударнага кварталу, з падрыхтоўкай першага рапарту Х-му зьезду ЛКСМБ і пасьпяховым фінішам да IX зьезду УсеЛКСМ можна будзе дабіцца патрэбных вынікаў і даць эстафэце сапраўдны бальшавіцкі поўны ход.

Чорная дошка

СТАРОБІН

— Ніякай працы па культэстафэце не вядзецца. Райком комсамолу ўключыўся ў культэстафэту, але абмежаваўся ўрачыстымі гэстамі. Харчаваньне вучняў не наладжана. Няма падручнікаў, абутку і адзежы.

КЛІЧАЎ

— Комсамольская організацыя ня прымае патрэбнага ўдзелу ў культэстафэце. Да гэтага часу ня выяўлены няпісьменныя і ніякай працы па ліквідацыі няпісьменнасьці не праводзіцца. Здаюць пазыцыі.

ГРЭСК

— Комсамольцы ня ведаюць аб культэстафэце. Комсамольскія ячэйкі раёну ніякай працы па культэстафэце не праводзяць. РК ЛКСМБ ігнаруе гэтай адказьнейшай справай культурнай рэволюцыі.

КАМАРОВІЧЫ

— Яшчэ да гэтага часу ня ўключыліся ў культэстафэту. Нічога не праведзена ў галіне ўсеагульнага навучаньня і політэхнізацыі школы. Ні разу не абгаварвалі пытаньне культэстафэты на сходзе.

ВЕТРЫНА

— Культэстафэта вагразла ў дарозе. Райштаб абмежаваўся адным пасяджэньнем. Профсаюзы і комсамол не абгаварылі задач культэстафэты і бязьдзейнічаюць. Ажыцьцяўленьне маршрутаў зрываецца.

ВУШАНЫ

— Усеагульнае навучаньне зрываецца. Яшчэ няма штабу культэстафэты. Таксама ніякай працы па ажыцьцяўленьню маршрутаў культэстафэты па раёне не праводзіцца. Комсамольская організацыя бязьдзейнічае.

„Адчапецеся з ВАШАЙ эстафэтай"

Старт культэстафэце ў Барысаве быў дадзен 31-га кастрычніка. На прысьвечаным культэстафэце ўрачыстым вечары прысутнічала звыш 2000 чалавек. Прадстаўнікі розных організацый абяцалі па-баявому правесьці культэстафэту.

І сапраўды ўзяліся па-баявому. Па ўсіх прадпрыемствах, установах былі праведзены мітынгі, сходы па пытаньню культэстафэты, але далей мітынгаў, сходаў і організацый опэрацыйных троек справа не пашла.

Райштаб РК ЛКСМБ і КП(б)Б не кіравалі опэрацыйнымі тройкамі. РК ЛКСМБ абмежаваўся тым, што паслаў ячэйкам дырэктывы. На бюро РК ні разу не абгаварылі ход эстафэты. Райштаб разаслаў маршруты і толькі. А што-ж дзеецца на мясцох?

На фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна" опэрацыйная тройка організавала толькі адзін лікпункт. На „Домбалі" старшыня опэрацыйнай тройкі заявіў брыгадзірам па праверцы культэстафэты: „Што? Пра культэстафэту? Так і запішэце: нічога ня зроблена".

З заводу „Комінтэрн" брыгада выехала на вёску, дзе правяла сход па пытаньню культэстафэты. Лікпункт наведваецца слаба.

На комбінаце няма пляну правядзеньня культэстафэты. Тры тыдні таму назад адбыўся прысьвечаны культэстафэце мітынг. Далей гэта справа не пашла.

Наогул у Барысаўшчыне амаль нічога ня зроблена для культэстафэты. Заводзкія організацыі не аддаюць належнае ўвагі гэтаму важнаму пытаньню. Калі да старшыні мясцкому чыгункі тав. Дразда прышлі брыгадзіры, дык ён папрасіў прыйсьці заўтра, а на заўтра сустрэў брыгадзіраў такімі словамі: **„Адчапецеся ад мяне з вашай культэстафэтай. Дужа яна ў мяне ў галаве ляжыць гэта ваша эстафэта. Ды і наогул у мяне няма часу займацца вашымі эстафэтамі".** Комэнтарыі не патрэбны.

Па вёсках становішча яшчэ горш. У шмат якіх сельсаветах ня ведаюць аб культэстафэце. У 30 сельсаветах організавалі толькі 4 лікпункты. Амаль ва ўсіх сельсаветах нічога ня зроблена і толькі ў Печкаўскім праведзен сход і гутаркі аб культэстафэце.

БЦРК не забясьпечвае ШКМ патрэбнымі прыладамі, абуткам і адзежай, спасылаючыся на спажывецкае таварыства, якое ў сваю чаргу спасылаецца на БЦРК. А школы колгаснай моладзі так і застаюцца ні з чым.

Аб усім гэтым добра ведае штаб культэстафэты, але ніякіх мер ня прымае. **Мы патрабуем распусьціць штаб і прыняць безадкладныя захады к далейшаму прасоўваньню культэстафэты і ліквідацыі гэтых прарываў.**

Г. Кугель.

Абмежаваліся паперкамі

Організацыі Петрыкаўскага раёну ў правядзеньні культэстафэты нічога практычнага не зрабілі. Раённы штаб, паасобныя колектывы і ячэйкі комсамолу не накіравалі сваю працу на ліквідацыю няпісьменнасьці, на пашырэньне школьнай сеткі, організацыю чырвоных куткоў, хат-чытальняў. Яны абмежаваліся рассылкай паперак і гутаркамі, прыняўшы іх „да ведама".

Дэкадныя справаздачы брыгад і камісій зусім не практыкуюцца. Гэта дало ўжо свае вынікі. Школьная сетка раёну як была, так і засталася без настаўнікаў. Новых чырвоных куткоў, хат-чытальняў не адкрывалі, а старыя не працуюць.

Цікава адзначыць, што РК ЛКСМБ, ня гледзячы на тое, што комсамол Беларусі зьяўляецца шэфам усеагульнага навучаньня, нічога ў гэтай галіне не зрабіў, акрамя таго, што заслухаў пяціхвілінную інформацыю на сваім пасяджэньні і прыняў яе да ведама.

Пры далейшай бязьдзейнасьці РК і штабу, культэстафэта у Петрыкаўскім раёне будзе правалена. Патрэбны тэрміновыя захады.

Я. КРУШЫНА.

Чырвоная дошка

Пухавічы

— Створан штаб, які організаваў брыгады па сельсаветах. Пытаньні культэстафэты прапрацаваны на партыйных і профэсыянальных сходах. Разгорнута праца ў лікпунктах і хатах-чытальнях.

Сьвіслач

— Культэстафэце дадзен поўны ход. Мобілізавана 20 чалавек на ліквідацыю няпісьменнасьці. Распрацаваны дакладныя маршруты, якія праводзяцца ў жыцьцё. Праведзен суботнік на карысьць політэхнізацыі.

Магілеў

— Увесь актыў мобілізаваны на справу культэстафэты. Па прадпрыемствах Магілева праведзены мітынгі і сходы. Добра разгорнута праца па правядзеньню культэстафэты і ажыцьцяўленьню паасобных маршрутаў па горадзе і раёнах.

Капцэвічы

— На заводзе „Зьвязда" вылучан штаб па правядзеньню культэстафэты. 7-га лістапада адбыўся прысьвечаны культэстафэце масавы вечар. Разгортваецца праца па ажыцьцяўленьню ўсіх маршрутаў.

Слуцак

— Ячэйка ЛКСМБ пры слуцкіх аднагадовых пэдкурсах наладзіла выхад на вёску па пытаньню культэстафэты. Студэнты прымаюць надзвычайна актыўны ўдзел у прасоўваньні маршруту культэстафэты. Зьнішчаем перашкоды.

Нароўля

— Ужо месяц, як раён уключыўся ў культэстафэту. Створан штаб, які распрацаваў конкрэтны плян дзеяньня. Упаўнаважаныя прыступілі да працы. Організаваны суботнікі на карысьць політэхнізацыі.

35 дзён РАШАЮЧЫХ БОЕК 35 дзён

у падрыхтоўцы да 3-га году пяцігодкі ХТО АТРЫМАЕ ГАНАРОВЫ СЬЦЯГ?

Да канца ўдарнага квартала засталіся лічаныя дні. Яны зьяўляюцца рашаючымі ў барацьбе прадпрыемстваў за атрыманьне ганаровых сьцягаў ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ.

Выкананьне якасных і колькасных паказчыкаў програмы, прыстасаваньне ўсёй працы на падрыхтоўку да 3 году пяцігодкі—вось умовы, пры выкананьні якіх нашыя прадпрыемствы могуць атрымаць ганаровы сьцяг.

Комсамол „Дняпроўскай Мануфактуры" з бальшавіцкай заўзятасьцю змагаецца за ліквідацыю прарываў. Ныцікам, маловерам і правым падгалоскам ён адказвае організацыяй комун і скразных брыгад.

Чырвонаштандартны завод „Бальшавік", які ўключыўся ў конкурс на атрыманьне сьцяга, **за лістапад месяц ня выконвае якасных паказчыкаў прамфінпляну.**

Падхапіць вопыт Бабруйскіх комсамольцаў, організаваць двухтыднёвік мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў, узьняць усю грамадзкасьць супроць гультаёў, п'яніц і лятуноў—вось задача комсамолу „Бальшавік" на бліжэйшыя паўтара месяцы.

35 дзён рашаючых боек павінны прынесьці з сабой перамогу на гаспадарчым фронце, поўную баявую гатоўнасьць для сустрэчы 3 рашаючага году пяцігодкі.

Мінусы ператварыць у плюсы

Фабрыка „Дняпроўская мануфактура" за другі год пяцігодкі не дадала 1400000 мэтраў мануфактуры.

Комсамольскі колектыў фабрыкі мобілізаваўся. У ткацкім цэху утвораны комсамольскі комплект, які перашоў на адну разьліковую кніжку. У сваёй рабоце ён дае добрыя паказчыкі.

Па прыкладу гэтага комплекту ідзе організацыя колектываў і ў іншых цэхах. Пачата падрыхтоўка да організацыі скразной брыгады, якая ахопіць усе цэхі фабрыкі.

Ва ўдарную работу ўключыўся тэхпэрсонал ткацкага цэху. Ён організаваўся ва ўдарны колектыў па рамонту варштатаў, сьцёршы межы паасобных комплектаў.

У выніку гэтых мерапрыемстваў мы маем выкананьне прамфінпляну на 99 проц. Гэта нашы плюсы. Але... ня ўсе комсамольцы ўцягнуты ва ўдарныя брыгады. Многія ня выконваюць нормы. Асабліва адстае матальны цэх, дзе комсамольская ячэйка не праводзіла вытворчай работы, за што бюро яе было распушчана.

Ячэйка ткацкага цэху ўзяла на буксір матальную. Сярод комсамольцаў можна спаткаць і такіх, якія выступаюць супроць прамфінпляну, супроць нашых тэмпаў. Такім выступленьням уся комсамольская маса дае рашучы адпор.

Для выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу і сапраўднай падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі патрэбна ўсе нашы мінусы ператварыць у плюсы.

М. Б. ФРУМКІН.

Ганебныя 15 проц.

На заводзе „Зьвязда" (Капцэвічы) не ліквідаваны яшчэ прарывы. Прамфінплян за кастрычнік ня выканан па фанэрнай вытворчасьці на 15 проц., па лесапільнай на 20 процантаў.

Комсамол не мобілізаваў моладзь на барацьбу за ліквідацыю прарыву. У апошнія дні наглядаюцца выпадкі, калі комсамольцы за прагулы здымаюцца з працы, заносяцца на чорную дошку.

З прычыны дрэннай пастаноўкі працы, назіраецца бытавое разлажэньне сярод паасобных членаў комсамолу, што бязумоўна надзвычайна хваравіта адбіваецца на працы ўсяго комсамольскага колектыву.

Комсамольская ячэйка заводу „Зьвязда" „змагаецца" за прамфінплян.

Неабходна аздаравіць колектыў комсамолу, узмацніць кіраўніцтва, бо сэкратар колектыву не карыстаецца патрэбным аўторытэтам і ня мае ўплыву на комсамольцаў.

Трэба прыняць тэрміновыя захады з тым, каб аздаравіць комсамольскі колектыў заводу „Зьвязда" і стварыць умовы, пры якіх-бы комсамольскі колектыў здолеў стаць сапраўдным барацьбітом за прамфінплян.

Вока.

Змагацца за якасьць

Адозва ВКК і трыкутніка да рабочых заводу „Бальшавік" чырвоным палотнішчам трывожна гудзіць аб пагоршаньні якасьці продукцыі.

Факты гэта сьцьвярджаюць. У асноўным цэху заводу — хромавым у кастрычніку прамфінплян быў выкананы ў колькасных паказчыках на 115,32 проц., а ў цэнасных на 108,4 проц. Тады ўся грамадзкасьць была мобілізавана навакол выкананьня прамфінпляну і барацьбы за якасьць продукцыі.

20 дзён лістапада ствараюць пагражаючы малюнак. Калі ў колькасных паказчыках програма выкана на 117,18 проц., дык у цэнасных—толькі на 89,12 проц.

Аслабленьне ўвагі да барацьбы за якасьць продукцыі дае зьніжэньне яе на 28,06 проц.

Стругалі 3-й зьмены з 700 скур далі 172 скуры браку. Па віне рабочага Дагмана плаціровачная машына была выведзена з строю на дзьве зьмены.

Падсекі скур, недадубленасьць, адушыстасьць, жорсткасьць і цэлы шэраг мэханічных бракаў па віне рабочых прыводзяць да зьніжэньня процанту якасных паказчыкаў.


Выросткі, замест адхіленьня сортнасьці на 11 проц., як належыць па пляну, складаюць 20,82 проц. Паўскурнікі замест 11 проц. даюць 19,79 проц.

Па паасобных відах сыравіны мы маем перавыкананьне якасных паказальнікаў. Так, апойкі, замест 10 проц. браку даюць 8,04 проц., шаўрэт—замест 10 проц. дае 9,40 проц., сабака—замест 9 проц. дае 6,11 проц.

Вітрына браку паказвае пагражаючае становішча з якасьцю продукцыі.

Мы змагаемся за сьцяг, а гэта абавязвае нас безадкладна мобілізаваць усе магчымасьці на 100 проц. выкананьне якасных паказчыкаў прамфінпляну.

МІНКІН.



„Чырвоную Зьмену“—у масы!

У палоне правай практыкі

(Лагойская райконфэрэнцыя комсамолу)

З прычыны неразгаваньня на сыгналізацыю друку і зацiск самакрытыкі, організацыя на здольна была выкрыць усе опортуністычныя практыкі з боку кіраўніцтва райкому і шэрагу комсамольскіх ячэек.

На Лагойскай раённай конфэрэнцыі, у спрэчках па дакладу сакратара РК КП(б)Б тав. Круглякова выступіў т. Файн, які солідарызаваўся з праваопортуністычнымі „установачкамі“ Целешава, кажучы, што ў комсамоле няма актыву; актыў паехаў вучыцца, а засталіся слабыя“ і г. д.

Конфэрэнцыя не асудзіла „філёзофіі“ Файна, недацаніўшы яе політычнай сутнасьці.

Па справаздачы РК КСМ некаторыя таварышы імкнуліся замазаць найўнасьць буйных прарываў у працы і становішча Лагойскай організацыі.

Вось факты:

Комсамольская організацыя стаіць у баку ад колектывізацыі, таму ня дзіва, што Лагойскі раён колектывізаваны да гэтага часу ўсяго на 12 пр. Пытаньнем далейшага разгортваньня і замацаваньня колгаснага руху некаторыя ячэйкі КСМ ячэйкі зусім не займаліся (яч. „Бальшавік“, „Лепшая Доля“, „Профсаюзная“, Дзяржынскага“ і інш.).

Праца па організацыі шырокага прыліва бядняцка-серадняцкіх мас у колгас не разгорнута (Янушковічы).

Няма сярод комсамольцаў колгасаў і працоўнай дысцыпліны, комсамольцы позьняцца на працу („Лепшая Доля“, „Дзяржынскага“, Швабскі).

У колгасе „Дзяржынскага“ комсамольцы ня толькі ня ўдзельнічаюць ва ўдарніцтве, але перашкаджаюць гэтаму, наладжваюць вячоркі, п'янствуюць, а потым дзяруцца.

Гадовы плян хлебазагатовак выканан толькі на 45 проц. а плян бульбазагатовак на 24 проц.

Конфэрэнцыя не мобілізавала ўвагі ўсёй комсамольскай організацыі на організацыю бядняцка-батрацкай моладзі, на барацьбу з кулацтвам і ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Пытаньні клясавай барацьбы на вёсцы зусім выпала з кола дзейнасьці райкопраўнікоў.

Конфэрэнцыя ў сваіх пастановах нічога не сказала аб нацполітыцы аб барацьбе з вялікадзяржаўным расейскім шовінізмам, з беларускім нацдэмократызмам і іншымі шовінізмамі.

З. Раскінд.

ЦКК, ЦСПСБ, Кастрычніцкі і Фрунзэўскі райкомы КП(б)Б і РайКК склікаюць 2-га сьнежня г. г., а 6 й гадзіне ўвечары, у клюбе Карла Маркса гарадзкі зьлёт рабочых-вылучэнцаў сумесна з сакратарамі партыйных, комсамольскіх ячэек, старшынямі фабзаўмясцкомаў, кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менску.

На нараду запрашаюцца рабкоры гор. Менску.

Абвестка дня: Аб становішчы рабочага вылучэнства і рабоце з вылучэнцамі.

Ударнаму пяцідзёньніку—баявыя тэмпы

Да X зьезду ЛКСМБ абавязак аб 40000 тыражу „Чырвонай Зьмены“ райорганізацыямі павінен быць выканан

Безадкладна разгарнуць работу па пяцідзёнцы

„Раёну, які лепш організуе справу, выканае і перавыканае кантрольныя лічбы, прадаставіць адно дарадчае месца на зьезд УсеЛКСМ“

(З пастановы ЦК ЛКСМБ).

З 25 лістапада распачата ўдарная пяцідзёнка „Паходу за газэту“. Ініцыятыва колектыву ЛКСМБ рэдакцый газэт падтоплена комсамольскай організацыяй, шэраг ячэек і колектываў па-сапраўднаму ўключыліся ў правядзеньне пяцідзёнкі, шырока разгарнуўшы падпіску на „Чырвоную Зьмену“ сярод комсамольцаў і працоўнай моладзі з тым, каб да зьезду ЛКСМБ поўнасьцю ўзброіць організацыю газэтай.

Аднак, паасобныя ячэйкі яшчэ не распачалі правядзеньня гэтага мерапрыемства, недацэньваючы „Выключнай важнасьці і ролі друку ў прыцягненьні комсамольскіх мас і мас рабочай, батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі ў падрыхтоўку і ўдзелу ў зьездах комсамолу“. (З пастановы ЦК ЛКСМБ). Весткі з раёнаў сыгналізуюць аб тым, што шэраг райорганізацый таксама недаацэньвае гэтага мерапрыемства, не распачаў яшчэ правядзеньня пяцідзёнкі.

Пяцідзёнку „Паходу за газэту“ павінны зараз-же распачаць усе раёны, і правесьці яе пад кутом праверкі выкананьня соцумовы, пад кутом выкананьня кантрольных лічбаў па тыражу „Чырвонай Зьмены“. За час пяцідзёнкі павінны быць завербаваны новыя тысячы падпісчыкаў газэты. **Газэта павінна быць шырока прасунута ў масы б/п працоўнай моладзі.**

Да зьезду ЛКСМБ райорганізацыі павінны выканаць абавязак аб 40000 тыражы „Чырвонай Зьмены“.

Выклікаюць сямігодкі БССР

Сярод вучняў Заслаўскай сямігодкі распаўсюджана 100 экз. „Чырвонай Зьмены“. Вярбоўку падпісчыкаў на газэту праводзіць спэцыяльна вылучанае зьвяно па распаўсюджваньню друку.

Заслаўская школа сямігодка выклікае на спаборніцтва па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ ўсе сямігодкі БССР.

А. Сумны.

Дамо гадовых падпісчыкаў

Комсамольскі сход яч. малога рамонту вагонаў ст. Менск—пасажырская пастанавіў уключыцца ў правядзеньне ўдарнай пяцідзёнкі „Паходу за газэту“. На сходзе прынята пастанова аб гадовай падпісцы на „Чырвоную Зьмену“. Вылучана брыгада для збору падпіскі сярод б-п моладзі. **Яч. МРВ—пасажырская выклікае на спаборніцтва на лепшае правядзеньне пяцідзёнкі цэх. ячэйкі колектыву ЛКСМБ чыгуначнага вузла ст. Менск.**

Д.

Прымаем выклік

Сход комсамольскай ячэйкі МШУ Менскага чыгуначнага вузла, абгаварыўшы выклік на спаборніцтва на лепшае правядзеньне ўдарнай пяцідзёнкі „Паходу за газэту“ ячэйка МРВ, прыняў выклік. Разгорнута праца па збору падпіскі на „Чырвоную Зьмену“ сярод комсамольцаў і вучняў школы.

Б.

Выпісаць газэту да канца пяцігодкі

Савецкая комсамольская ячэйка Лельчыцкага раёну абгаварыла пытаньне аб падпісцы на „Чырвоную Зьмену“. Сход аднагалосна прыняў пастанову выпісаць „Чырвоную Зьмену“ да канца пяцігодкі і выклікаў на спаборніцтва ўсе ячэйкі раёну.

КАРОЛЬ.

Слаба падрыхтаваліся

На заводзе „Комунар“ падрыхтоўка да пяцідзённага паходу за газэту прайшла слаба. Паход па организацыі пачаўся, а яшчэ ня ўсе комсамольцы і моладзь заводу інформаваны аб мерапрыемствах якія павінны быць праведзены па заводзе ў час пяцідзёнкі.

На сёньнешні дзень толькі ў ліцейным цэху справа наладжана здавальняюча. Тут ячэйкавы ўпаўнаважаны—Голуб Х.—дамагаецца 100 проц. ахопу комсамольцаў газэтай. У астатніх цэхах справа пастаўлена слаба.

Трэба зараз-жа разгарнуць працу. Пяцідзёнка павінна пакласьці пачатак пляновай тыражна-масавай рабоце па колектыву з юнацкімі і дзіцячымі выданьнямі. Усе мерапрыемствы, якія намечана правесьці па колектыву ў час пяцідзёнкі, павінны быць праведзены па-ўдарнаму.

Х.

Выпісваем і выклікаем

Комсамольская ячэйка 2-ой Дзяржаўнай ф-кі „Чырвоны Харчавік“, абгаварыўшы пытаньне аб распаўсюджваньні комсамольскага друку, пастанавіла выпісаць 60 экз. „Чырвонай Зьмены“ і выклікае на спаборніцтва мэблёвую фабрыку імя „Халтурына“.

Культсэктар.

Мною завербавана 105 падпісчыкаў на газ. „Чырвоная Зьмена“. Выклікаю на спаборніцтва па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ вучняў Петрыкаўскай ФЗШ.

Туравец П.

Лёзунг выканан

Ячэйка ЛКСМБ Віцебскага дзённага рабфаку выканала лёзунг: „Ніводнага комсамольца без комсамольскай газэты“. Усе комсамольцы падпісаліся на „Чырвоную Зьмену“, таксама падпісаліся і шмат беспарт. студэнтаў.

Данчэнка-Казлоў.

Патрабуем ўвагі!

Ужо некальк раз пісалася ў „Чырвонай Зьмене“ аб тым, што ў школе ФЗВ—кулінары небясьпечна. За адзін год навучаньня перамянілася 5 загадчыкаў. Кожны з іх акраме працы ў ФЗВ, меў яшчэ некалькі нагрузак. Таксама за гэты час уцяклі 3 вучні з школы, што сыгналізуе аб надзвычайна дрэннай пастаноўцы выхаваўчай працы.

Вучні скарыстоўваюцца на чорнай рабоце. Тэорыя ўвязкі з практыкай ня ўключана ў програму Будынак, у якім знаходзіцца ФЗВ не адпавядае патрэбнасьці школы. Памяшканьне неацяпляецца. На лекцыях вучням прыходзіцца пісаць на каленях з-за адсутнасьці патрэбнага абсталяваньня. У гэтым-жа памяшканьні жывуць 6 вучняў, якія сьпяць на падлозе ў самых дрэнных умовах.

Вучні ФЗВ—кулінары ўжо не раз ставілі пытаньне перад МЦРК і іншымі органамі аб палепшаньні становішча школы, але нічога ня ўмешваецца і ня прымае належных захадаў для палепшаньня становішча школы.

Такія адносіны да школы пагражаюць зрывам падрыхтоўкі кадраў грамадзкага харчаваньня, што ва ўмовах надзвычайна балючча можа адбіцца на выкананьні прамфінпляну і комунізацыі нашага быту.

ФЗВ—кулінары патрабуе да сябе больш увагі.

Саламонаў.

Нам пішуць

— Па Блускім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, праца з беднатой не вядзецца. Група беднаты пры сельсавеце ня створана. Гаспадарча-політычныя кампаніі, як хлеба, бульбазагатоўкі, самаабкладаньне і г. д. на сходах беднаты не абгаварваліся. Комсамольская ячэйка не праводзіць работы з беднатой.

Я. Ліпніцкі.

Паведамленьне

Сёньня, 27 лістапада, а 7-ай гадзіне ўвечары адбудзецца нарада піонэрактыву: павадыроў баз, фарпостаў, атрадаў, старшынь савеатаў груп „ЮК“, рэдколегій, павадыроў зьвеньняў, кіраўнікоў груп ацкіпраў.

Адказнасьць за забясьпечаньне нарады ўскладаецца на сакратароў ячэек і павадыроў.

Збор у цэнтральным піонэрскім клюбе.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР— РЭДКОЛЕГІЯ.

400 згубленых рабочых дзён

Наступілі халады. Вучні арматурнага цэху Менскага Будвучу пры Белдзяржбудзе ня маюць яшчэ памяшканьня для працы. Усё лета працавалі пад паветкай, на даждзы. Неаднокраць сыгналізавалі аб немагчымасьці працаваць пры такіх умовах. Але на ўсё адказвалі толькі абяцанкамі.

Мозачнікі перабраліся з фабрыкі-кухні на пабудову універсытэцкага гарадка. Там пачалі працаваць на бэтонным заводзе. Але гэты „завод“ без ацяпленьня, без сьвятла і неабходнай для працы вады. Ваду і пясок трэ' было насіць далёка ад памяшканьня ў той час, калі гэтыя матар'ялы магчыма было вазіць вагаткай.

Аб усім гэтым гаварылі яшчэ летась, пісалі ў „Чырвонай Зьмене“ насьценгазэце, але ніхто не зьвярнуў увагі. Да гэтага часу няма ніякага пляну працы. Загадчык тлумачыць, што на будаўніцтве немагчыма плянавая праца і што програма становішча школы не палепшыць. Але практыка паказвае іншае. Вучні не набываюць патрэбнай кваліфікацыі, бо большасьць часу знаходзяцца на чорнай працы.

На розную пабочную працу, як перавозка варштатаў, разгрузка цэманту і інш. за 4 з паловай месяцы патрацілі вучні больш 400 рабочых дзён. Столькі часу трацяць вучні, якія павінны за двухгадовы тэрмін навучаньня атрымаць неабходную політэхнічную асьвету!

Вучні ацяпленчага цэху, а таксама і бэтонная рубаць тунэлі для труб, б'юць бэтонныя падушкі і г. д., тады як гэтую працу маглі выканаць 4-5 чорнарабочых, захоўваючы капітоўны час навучаньня.

Становішча, якое зараз склалася ў школе, пагражае зрывам вучобы.

Самакрытыкоўскі.

Прадвыбарчая кампанія ў ПАЗШ



У сувязі з выбарамі ў конгрэс (амэрыканскі парлямант) компартыя організавала папярэдні выбараў грандыёзны масавы мітынг, які прайшоў пад лёзунгам барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і за абарону СССР і патрабаваньня ўвесьці страхаваньне для беспрацоўных і дапамогу беспрацоўным.

НА ЗДЫМКУ:—Агульны выгляд мітынгу.

Згублены

— Комс. біл. за № 94007, на імя Жыцельзэйф Э., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Комс. біл. за № 147245, на імя Армянок Кац., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Комс. біл. за № 81560, на імя Басевіч М. З., выд. Бабр. АК ЛКСМБ.

— Пашпартная кніжка на імя Зяньковіч, выд МенЦРК.

— Наборная кніжка, на імя Хомчанка Г. П., выд. Мен ЦРК.

— Знойдзен комс. біл. за № 38967, на імя Куніцкага М. Я., выд. Мен. АК ЛКСМБ, лічыць сапраўдным.

— Пасьведчаньне на імя Лібеса, Партона і Труса, выд. 1-гадовымі курсамі пры Белпэтэхнікуме.

— Комс. біл. за № 12220, на імя Кнышава Ал., выд. Аршанскім АК ЛКСМБ.

— Комс. біл. за № 128365, на імя Кості Я. Б., выд. Вяроскім РК КСМ.

— Профсаюзная кніжка саюзу РЗЛ за № 95488, на імя Раманоўскай Р., выд. Мазырскім акр. юаам РЗЛ.

— Комс. біл. за № 1962, на імя Розэнблюма Б. Е., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Кніжка аб'яднанай профсаюзы, на імя Фуксон Ц., выд. Мен. профкоміаам.

— Біржавая картка юнака за № 147, на імя Бусловіча Р. Ф., выд. Мен. біржай працы.

— Комс. біл. за № 76960, на імя Тарасевіча Я. Я., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Комс біл. за № 12657, на імя Габца Міколы, выд. Бярэзінскім РК КСМ.

— Комс. біл. за № 72482, на імя Царэўскі П. А., выд. Вушацкім РК КСМ.

— Комс. біл. за № 125113, на імя Дарошкі Н. Б., выд. Мазырскім РК КСМ.

— Комс. біл. за № 47181, на імя Бамароўскага Ўл., выд. Бабруйскім РБ КСМ.

— Заліковая картка на імя Цуркова Ф. У., выд. Менскім тэхнікумам.

Менск, друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 509